фронту і рабочымі-чырвонагвардзейцамі Мінска Голуб стаў на абарону рэвалюцыі ад пасяганняў контррэвалюцыйнага «Камітэта выратавання рэвалюцыі».

П. Ф. Голуб удзельнічаў ва ўстанаўленні Савецкай улады ў Плешчаніцах, Зембіне, Камена і іншых населеных пунктах Барысаўшчыны.

Калі ж унутраныя і знешнія ворагі пачалі вайну супраць маладой рэспублікі Саветаў, Палікар Голуб на чале 1-га Канскага савецкага батальёна змагаўся на Забайкальскім фронце. Яму, аднаму з першых савецкіх камандзіраў, давялося граміць мяцежнікаў чэхаславацкага корпуса, белагвардзейскія полчышчы Калчака, Дзянікіна, банды Махно, войскі буржуазна-памешчыцкай Польшчы.

У снежні 1921 года Голуба прызначылі камісарам Мінскай школы міліцыі, а праз некаторы час ЦК КП(б)Б накіраваў камуніста ў Барысаў начальнікам аператыўнай групы па барацьбе з бандытызмам. Адначасова П. Ф. Голуб узначаліў гарадскую міліцыю. З белабандыцкай нечысцю было скончана. Нарэшце Палікар Фаміч здаў зброю і прыняўся за адвечную сялянскую працу.

У рэспубліцы ствараліся калектыўныя гаспадаркі. Камуніста, выдатнага арганізатара, чалавека, усёй душой адданага роднай зямлі, Палікара Фаміча Голуба землякі выбралі старшынёй калгаса «Маяк сацыялізму».

Мірная праца была перапынена Вялікай Айчыннай вайной. П. Ф. Голуб змагаўся ў радах атрада народных мсціўцаў «За Савецкую Беларусь». Пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў — на савецкай і гаспадарчай рабоце. Усе свае сілы ён аддаваў аднаўленню народнай гаспадаркі.

Палікара Фаміча Голуба добра ведалі на прадпрыемствах, у школах Барысаўскага раёна. Нават будучы пенсіянерам ён стараўся прыносіць карысць грамадству: ахвотна расказваў моладзі пра гістарычныя падзеі, сведкам і ўдзельнікам якіх быў сам. Да апошняга дня ветэран быў у страі.

У школьным музеі захоўваюцца фотаздымкі і дакументы П. Ф. Голуба. Удзел яго ў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі адлюстраваны ў экспазіцыях Дзяржаўнага музея БССР і Барысаўскага краязнаўчага музея.

**І. ЛУК'ЯНЧЫК,**
**старшы навуковы супрацоўнік**
**Дзяржмузея БССР.**

# З ГІСТОРЫІ РАЗВІЦЦЯ НАВУКІ

Станаўленне навукі і вышэйшай школы ў рэспубліцы непарыўна звязана з перамогай Вялікага Кастрычніка. Даследчай работай да рэвалюцыі ў Беларусі займаліся тры доследныя сельскагаспадарчыя станцыі. У 1913 г. працавала 80 навуковых супрацоўнікаў.

ЦК КП(б)Б і ўрад рэспублікі, праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку, прынялі шэраг мер па ліквідацыі непісьменнасці і арганізацыі народнай адукацыі, адкрыццю вышэйшых навучальных і навуковых устаноў. Так, аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута ў Віцебску ў 1918 г. было пераўтворана ў самастойны археалагічны інстытут. За чатыры гады яго існавання была праведзена значная работа па вывучэнню гісторыі краю. У Віцебску адкрылі батанічны сад і ветэрынарны інстытут. У Горках была адноўлена вышэйшая сельскагаспадарчая ўстанова, закрытая ў 1864 г. Для арганізацыі навучальнага працэсу і даследчай работы выдаткоўваліся 2 млн. рублёў. На чатырох факультэтах (меліярацыі, лясным, землеўпарадкавальным, агранамічным) выкладалі вучоныя С. М. Басаў, І. К. Багаяўленскі, Я. М. Бяссонаў, Г. М. Высоцкі, Л. В. Горскі, А. М. Горыгор'еў, А. І. Кайгародаў, К. Н. Караткоў, І. І. Красікаў, П. Н. Разанаў, М. В. Рытаў, Ф. Н. Турыцын, Л. І. Яшноў і інш.

У 1922 г. у Мінску пачаў працаваць Беларускі дзяржаўны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі, які ў 1925 г. быў уключаны ў састаў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. 14 сакавіка 1924 г. у інстытуце выступаў М. І. Калінін.

З адкрыццём Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1921 г.) пачалася планамерная падрыхтоўка кадраў для народнай гаспадаркі і навуковых даследаванняў. Да 10-й гадавіны Савецкай улады ў БССР працавалі 4 вну, дзе навучаліся 4632 студэнты [1].

Пасля ліквідацыі белапольскай інтэрвенцыі Наркамасветы БССР прыняў рашэнне аб стварэнні Інстытута беларускай культуры. Аднак цяжкія ўмовы пасляваеннага часу не дазволілі адразу прыступіць да выканання гэтага рашэння ў поўным аб'ёме. Спачатку была арганізавана Тэрміналагічная камісія, у задачу якой уваходзіла распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі па розных галінах ведаў. Праз год на базе Камісіі адкрыўся Інстытут беларускай культуры з секцыямі прыродазнаўства, сельскагаспадарчай, медыцынскай, сацыяльна-гістарычнай, беларускай мовы і літаратуры, мастацтва, па вывучэнню рэвалюцыйнага руху ў Беларусі. Першым старшынёй выбралі С. М. Некрашэвіча.

Вялікай падзеяй у грамадска-палітычным жыцці стала адкрыццё ў кастрычніку 1925 г. у Мінску Камуністычнага універсітэта імя У. І. Леніна. Перад слухачамі выступалі вядомыя дзеячы КП(б)Б В. Г. Кнорын, А. Р. Чарвякоў, М. М. Галадзед, І. А. Адамовіч, К. В. Гей, М. Ф. Гікала, Я. Б. Гамарнік.

Навукова-даследчая работа ў галіне сельскай гаспадаркі вялася на доследных і спецыялізаваных станцыях, у метэаралагічных бюро, НДІ сельскай і лясной гаспадаркі. У 1922 г. пад кіраўніцтвам прафесара А. Д. Дубаха ў Горках была створана першая ў краіне Заходняя доследная меліярацыйная станцыя, якая адыграла важную ролю ў развіцці айчыннай меліярацыі. Фарміравалася сетка інстытутаў медыцынскага профілю. У склад навуковых устаноў уваходзілі Беларуская дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна, Дзяржаўны музей, 6 навуковых таварыстваў. Вакол іх спачатку канцэнтраваліся навуковыя работнікі, якія прыехалі з іншых саюзных рэспублік, а затым і мясцовыя кадры.

Планаванне і кіраўніцтва ў галіне навукі вёў Наркамасветы БССР, які аказваў штодзённую падтрымку даследчым цэнтрам і каардынаваў іх работу, ствараў новыя інстытуты і лабараторыі. На Упраўленне вышэйшымі навучальнымі ўстановамі пры ЦВК БССР ускладалася



Будынак у Мінску на Рэвалюцыйнай, 15, у якім размяшчаўся ў 20-я гады Інстытут беларускай культуры.

вырашэнне пытанняў планавання навукі вну, вывучэння і выкладання прыродазнаўчых, тэхнічных і грамадскіх навук. Спецыялізаванымі органамі кіраўніцтва навуковай дзейнасцю былі адпаведныя аддзелы Наркамзема і Наркамата аховы здароўя. Павялічваліся бюджэтныя асігнаванні Наркамасветы, значная частка якіх выдаткоўвалася на фінансаванне вну і навуковых устаноў. Калі ў 1924 г. яны складалі 2747,6 тыс., то ў 1927 г. больш як 7040 тыс. руб. (2,5 раза). Гэта найбольш высокі рост сярод іншых рэспублік (у РСФСР — 1,6 раза, УССР — 1,7, АзССР — 1,2 раза)[2].

Вялася карэнная перабудова і дэмакратызацыя ўсёй сістэмы адукацыі, што дало шырокія магчымасці для ўдзелу працоўных у навуковай творчасці. У маі 1921 г. СНК РСФСР па просьбе ўрада Беларусі прыняў спецыяльны дэкрэт аб адкліканні з устаноў РСФСР і вяртанні ў БССР работнікаў культуры — ураджэнцаў Беларусі [3]. Навуковыя кадры папаўняліся за кошт выпускнікоў вну. Яны заставаліся пры кафедрах, камандзіраваліся на вучобу і практыку ў навукова-даследчыя ўстановы Масквы і Петраграда. У 1927 г. пры БДУ і Інбелкульце адкрылася аспірантура. У ліку першых аспірантаў універсітэта былі гісторыкі А. В. Бурдзейка, Д. А. Дудкоў, Ф. І. Забела, К. І. Кернажыцкі, Ц. І. Сцяпанаў.

Вялікую дапамогу ў развіцці навукі аказалі савецкія рэспублікі і перш за ўсё РСФСР і УССР. Так, з Масквы і іншых гарадоў краіны ў пачатку 20-х гадоў у Беларускі політэхнічны інстытут прыехалі прафесары Н. І. Андрэеў, В. А. Ляпёшкін, В. І. Пераход і іншыя вучоныя. Расійская АН, Маскоўскі універсітэт, Наркамасветы і іншыя Нарка-

маты РСФСР аказалі дапамогу БДУ ва ўмацаванні матэрыяльнай базы.

Стварэнне за кароткі тэрмін навучальных і навуковых цэнтраў, планамерная падрыхтоўка нацыянальных кадраў садзейнічалі развіццю навуковай работы. Вучоныя даследавалі энергетычныя рэсурсы, запасы мінеральнай і раслiннай сыравіны, правялі геамагнітныя здымкі. Ужо ў 1924 г. па праекту прафесара У. В. Шкацелава быў пабудаваны першы газавы завод у рэспубліцы. Пачаліся сістэматычныя даследаванні ў галіне біялогіі і сельскагаспадарчых навук; складзены карты раслiннасці БССР, арганізавана вывучэнне тарфяных балот і глебы. Гэта дазволіла атрымаць шэраг каштоўных звестак па сельскагаспадарчаму раянаванню тэрыторыі БССР. У 1928 г. была апублікавана манаграфія «Кліматычны атлас БССР». Вялікая работа вялася па гісторыі, мовазнаўству, літаратуры, этнаграфіі, эканоміцы.

Беларускія вучоныя выступалі з дакладамі на навуковых канферэнцыях, сімпозіумах, якія праводзіліся ў краіне і за мяжой. Яны арганізоўвалі рэспубліканскія форумы, на якія запрашалі калег з іншых рэспублік і з-за мяжы. Так, у канферэнцыях па рэформе беларускага правапісу, археолагаў і краязнаўцаў удзельнічалі спецыялісты адпаведных галін ведаў з Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі, Літвы, Латвіі.

К другой палове 20-х гадоў Інбелкульт вырас у кадравых і ідэйна-навуковых адносінах. Ён быў выдзелены ў самастойную ўстанову пры СНК БССР, які ў 1927 г. зацвердзіў яго Статут, блізкі да Статутаў АН СССР і УССР. За вялікі ўклад у арганізацыю і развіццё навуковых даследаванняў правадзейнымі членамі былі выбраны С. М. Некрашэвіч, І. І. Замоцін, А. М. Ясінскі, У. І. Пічэта, М. Ф. Бліадухо, Я. М. Афанасьеў, І. Д. Луцэвіч (Янка Купала), К. М. Міцкевіч (Якуб Колас), С. Ю. Матулайціс і інш. У адпаведнасці з выкладзенымі ў Статуце прынцыпамі рэарганізавалася яго структура, ствараліся спецыялізаваныя кафедры, лабараторыі і навукова-даследчыя інстытуты. Агульнае кіраўніцтва іх дзейнасцю здзяйсняў Акадэмічны савет.



У. В. Шкацелаў, акадэмік АН БССР.

Інбелкульт адыграў вялікую ролю ў развіцці нацыянальнай культуры і вывучэнні прыродных багаццяў. Ён аб'яднаў лепшыя навуковыя сілы рэспублікі і правёў значную работу па іх падрыхтоўцы. У студзені 1929 г. ва ўрачыстай абстаноўцы на яго базе была адкрыта Акадэмія навук БССР.

У цяжкае першае дзесяцігоддзе Савецкай улады ў рэспубліцы былі створаны ўсе неабходныя прадпасылкі для хуткага разгортвання навукова-даследчай работы. Новая сістэма арганізацыі даследаванняў садзейнічала праяўленню творчай ініцыятывы вучоных і адыграла значную ролю ў развіцці беларускай савецкай навукі.

**Г. КАРЗЕНКА,**
**кандыдат гістарычных навук.**

[1] Белорусская ССР в цифрах. К 10-летию существования БССР. 1919—1929. Миеск, 1929. С. 74.
[2] Научный работник. 1927, № 1. С. 24.
[3] Советская Белоруссия. Минск, 1922. С. 171.
[4] СЗ БССР. 1927, № 42. С. 226.